УДК 811.161.3’367

# СТЫЛІСТЫЧНАЯ РОЛЯ СІНТАКСІЧНЫХ СРОДКАЎ МАСТАЦКАЙ ВЫРАЗНАСЦІ

***К. А. Марозава*** (МДУ імя А. А. Куляшова)
Навук. кір. ***В. М. Шаршнёва***,
канд. філал. навук, дацэнт

Асноўнай прыкметай моўнага стылю можна лічыць фактар адбору моўных сродкаў. Значны ўплыў на адбор моўных сродкаў часта аказваюць такія фактары, якія караняцца не ў агульных умовах камунікацыі, а ў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

падыходзе таго, хто гаворыць, да свайго выказвання, у яго індывідуальнай устаноўцы. Бывае, што ўстаноўка таго, хто гаворыць, характарызуецца значнай складанасцю і выражаецца ў незвычайным адборы моўных сродкаў, а бывае, што такая ўстаноўка аказваецца больш простай, носіць больш тыповы характар.

Сродкі паэтычнага сінтаксісу разнастайныя. Іх ідэйна-мастацкая роля і прызначэнне – гэта ўзмацненне эмацыянальнай афарбоўкі, перадача розных адценняў інтанацыі і такім чынам больш поўнае і глыбокае раскрыццё зместу твора. Так, для павышэння эмацыйнасці мовы асабліва характэрна выкарыстанне такіх сінтаксічных фігур, як эліпс і інверсія.

У вершаваным тэксце прадметам аналізу найперш могуць стаць разнастайныя тропы, асаблівасці гукапісу, фігуры паэтычнага сінтаксісу. Так, стылсўтваральнымі сінтаксічнымі, фігурамі паэтычнай мовы А. Разанава з’яўляюцца анафара, эпіфара, кальцо страфы, кампазіцыйны стык і ўмаўчанне. Кожная з названых фігур, акрамя апошняй, заснавана на паўторы аднолькавых слоў, словазлучэнняў ці сказаў. Гэта дапамагае аўтрару шляхам арыгінальнай пабудовы радкоў, строф ці цэлых тэкстаў выявіць уласныя эмоцыі, уражанні; дасціпна выкацаць думку, звяртаючы ўвагу чытача на сэнсава ці эмацыйна важныя словы; сціпла ці, наадварот, разгорнута, праз асацыяцыі, адлюстраваць свет [1, с. 23].

Пастаяннае ўжыванне такіх прыёмаў, як інверсія, градацыя, разнастайных формах сінтаксічна-інтанацыйнага паралелізму з’яўляецца самай яскравай прыкметай індывідуальнага стылю А. Разанава.

Пры дапамозе разнастайных сінтаксічных сродкаў Алесь Разанаў выпрацаваў свой асабісты стыль, які адгадваецца з першых прачытаных радкоў.

**Літаратура**

1. Багамолава, А. «Сэнсу страта – страта ўсяго»: лінгвістычны наліз экспрэсіўных сінтаксічных сродкаў паэтычнай мовы А. Разанава / А. Багамолава // Роднае слова. – 2007. – № 2. – С. 23–24.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова